З нагоды

ШЛЯХ У ТЫСЯЧЫ ЛІТАР

Я шмат думаў, ці варта наогул пісаць з гэтай нагоды. Чарговы юбілей «Маладосці» — 65. Віншаванні, цёплыя словы, падзякі. Да ўласных знакавых дат я стаўлюся абыякава, але прайсці міма чужых не магу. Канешне ж, варта пісаць! Не хваласпевы, а проста адзначыць належнае, заслужанае часам і руплівай працай.

Пісаць і стаць пісьменнікам мне хацелася заўсёды. Адзначу, што юнаком, прыходзячы ў школьную бібліятэку, гартаючы там «Бярозку» і «Маладосць», я ніколі не думаў стаць аўтарам гэтых выданняў. Не ведаў яшчэ, што спачатку буду зрэдку дасылаць свае творы, а потым нават займею рэгулярную аўтарскую калонку. Мне, тады школьніку, слаба верылася ў тое, што мяне могуць недзе надрукаваць. Не тое, каб я быў ужо зусім бяздарны. Але ж мне рэальна не хапала смеласці, каб зрабіць першы крок.

Вагаўся аж да сканчэння ўніверсітэта, а рашыўся толькі, калі ўжо пайшоў на працу. Здавалася б — стаў дарослым, незалежным ва ўсіх сэнсах чалавекам, але ад дзіцячых мрояў — пісаць і публікавацца — не адступіў, не пакінуў іх у мінулым, як часцяком робяць. Купляючы чарговы свежы нумар «Маладосці», я браў яго ў рукі, адкрываў раздзел «Проза» і ўяўляў, як глядзелася б у ім мая «нятленка». Але ж у рэальнасці мае тэксты працягвалі ляжаць ці ў шуфлядах, ці ў папках камп'ютара. Смеласці па-ранейшаму не хапала, ніяк не мог адважыцца на тое, каб адаслаць што-небудзь з напісанага на рэдакцыйную пошту. Хоць, зноў жа, шмат разоў уяўляў, як раблю гэта, неаднаразова пісаў чарнавік, які потым выдаляў. Калі вы дачыталі да гэтага месца, пэўна, разумееце, куды я хілю.

Чым больш чытаў біяграфій розных празаікаў і паэтаў, тым больш разумеў, што друкавацца ў часопісах — абсалютна нармальная практыка. Пры гэтым некаторыя сусветна вядомыя літаратары, як, напрыклад, Юкіа Місіма, імкнуліся пісаць не толькі для салідных літаратурных выданняў, дзе пераважна друкуюць прызнаных аўтараў, але і для дзіцячых. Місіма друкаваўся паўсюдна, дзе толькі яму хацелася. Нават у часопісах для дзяўчынак можна адшукаць яго прозвішча. Хемінгуэй пісаў тэксты ў «Esquire» з самага першага нумара, і яму заўсёды было што сказаць. Натуральна, што яго нарыс 1936 года, які потым лёг у аснову аповесці «Стары і мора», трапіў у адмысловы нумар, дзе сабрана найлепшае за гісторыю часопіса.

У 2013 годзе, пяць гадоў таму, я, нарэшце, сабраўся з духам і цвёрда вырашыў публікавацца. Адаслаў свой першы твор, не асабліва верачы ў станоўчы адказ. Было гэта вясной, але ўжо ў ліпеньскім нумары часопіса, як падарунак да дня нараджэння, выйшла маё апавяданне «Блог». Цяпер я, канешне ж, так не пісаў бы, тым больш не друкаваў бы гэты твор. Таму залічым тую публікацыю ў якасці авансу, з прыцэлам на перспектыву і будучыню. Маўляў, можа яшчэ напіша што лепшае.

На гэтым гісторыя магла б скончыцца, калі б увосень таго ж года я не набыў кнігу «Скрозь «Маладосць»...», якая была адмыслова падрыхтавана да 60-годдзя выдання. У ёй сабраны гутаркі, разважанні, успаміны вядомых беларускіх літаратараў, якія друкаваліся і працавалі ў часопісе, а таксама дакументы — пратаколы пасяджэнняў рэдкалегіі за розныя гады. Дзякуючы ім мы можам цяпер уявіць, якім чынам на старонкі «Маладосці» траплялі творы тых, хто цяпер ужо прызнаны як класік, а тады быў яшчэ пачаткоўцам.

Кніга насамрэч унікальная для Беларусі, бо ў нашай краіне рэдка выходзяць падобныя выданні. А ў свеце такі жанр, як нон-фікшн, з'яўляецца не проста адным з самых папулярных, але і прыбытковых. На гісторыі добра зарабляюць усе, хто толькі можа. (Прыгадайце, колькі было шуміхі вакол прамінулага юбілею «Playboy», колькі было напісана пра гэты ўжо легендарны амерыканскі часопіс, які па ўсім свеце мае нацыянальныя версіі. Ды што напісалі — нават знялі серыял на аснове рэальных падзей.)

Не буду спойлерыць кнігу, адзначу толькі, што яе абавязкова варта знайсці і прачытаць, лепей нават набыць для ўласнай бібліятэкі. Такога ў Вікіпедыі дакладна не прачытаць — гэта ўжо для сапраўдных аматараў літаратуры і ўсяго, што вакол яе. І, зразумела ж, кніга матывуе, бо, не будзем крывіць душой, кожны літаратар хоча пакінуць нешта пасля сябе, хоць бы нейкую памяць. Інакш і не пісаў бы, не імкнуўся б данесці свае думкі да чытача, падзяліцца з грамадой трывогамі ды прагнозамі. Літаратар тады сапраўдны, калі ён не толькі спрабуе адказаць на выклікі рэчаіснасці, але і здольны гэтую рэчаіснасць фарміраваць, задаваць яе тон. Ну і, канешне ж, многім з нас, яшчэ маладым, хацелася б далучыцца да плеяды славутых майстроў пяра. Стаць у адзін шэраг з класікамі. Хіба не?

Гэта неверагоднае адчуванне — пісаць для часопіса, дзе некалі друкаваліся твае героі. А іх, як вядома, многа не бывае. І гэта таксама матывуе — на тваіх вачах нараджаецца і працягваецца традыцыя і пераемнасць, якой так часам не хапае беларускай справе.

Хочацца пажадаць рэдакцыі часопіса «Маладосць», каб яна яшчэ 100 гадоў цешыла нас сваёй працай. А супрацоўнікі і надалей вось так ахвотна давалі слова маладым, адкрывалі новыя імёны, вярталі з забыцця класікаў, ніколі не спыняліся на дасягнутым і заўсёды трымалі планку. Патэнцыйным жа аўтарам часопіса хочацца пажадаць смеласці, зусім крыху, роўненька каб хапіла на самы пачатак. Бо, як сцвярджаў старажытнакітайскі філосаф Лаа Цзы, «шлях у тысячу лі пачынаецца з першага кроку». І яго, безумоўна, варта зрабіць!

Канстанцін КАСЯК.

Падмосткі для юных

У ТЭАТР НЕ ГУЛЯЕМ!

Вялікая прыступка для маленькіх артыстаў

Дзіцячая музычная тэатр-студыя (ДМТС) пры Нацыянальным акадэмічным Вялікім тэатры оперы і балета — з'ява ўнікальная: не кожная тэатральная пляцоўка можа пахваліцца наяўнасцю юных артыстаў. Дэбют студыі адбыўся ў сакавіку 1990 года, калі прайшоў вялікі адкрыты канцэрт у суправаджэнні сімфанічнага аркестра тэатра. А ў канцы таго ж года на суд гледачоў была прадстаўлена першая прэм'ера — мюзікл кампазітара А. Будзько «Пітэр Пэн». Гэтая работа зацвердзіла ДМТС як непасрэднага і паўнапраўнага ўдзельніка опернага дзейства.

Дзіцячы музычны тэатр-студыя — частка вялікага тэатральнага механізма. Юныя артысты ўдзельнічаюць у спектаклях, дзе па задуме рэжысёра-пастаноўшчыка, балетмайстра або самога кампазітара патрабуецца ўдзел дзіцячага хору, мімансу або танцавальнай групы. Заняткі праходзяць, як правіла, тры-чатыры разы на тыдзень, рэпетыцыі цесна звязаны з графікам салістаў і афішай Вялікага. Адзін раз у год, у пачатку тэатральнага сезона, адміністрацыя прызначае дзень, у які ўсе ахвотныя дзеці могуць паспрабаваць патрапіць у ДМТС. Абавязковыя патрабаванні для хлопчыкаў і дзяўчынак, якія хочуць звязаць сябе з нялёгкім рамяством акцёра музычнага тэатра, — гэта наяўнасць пачатковай музычнай адукацыі, артыстычнасць, пластычнасць, узрост — 7-8 гадоў.

— Студыя дапамагае дзецям раскрыцца ў першую чаргу як асобам, а потым ужо як артыстам. Тут даюць не толькі навыкі харавых спеваў і акцёрскага майстэрства, прывіваюць любоў да опернага мастацтва, але і вучаць уменню кантактаваць з равеснікамі. Я, напрыклад, была вельмі замкнутым дзіцем, але сябры, якіх набыла тут, дапамаглі мне адчуць сябе сваёй у вялікай кампаніі, — кажа Кацярына Ігнаценка, вучаніца 10 класа сталічнай гімназіі № 8.

На рахунку студыі мноства оперных спектакляў: «Чароўная флейта» Моцарта, «Кармэн» Бізэ, «Князь Ігар» Барадзіна, «Сельскі гонар» Масканы, «Яўген Анегін», «Пікавая дама» Чайкоўскага — гэта толькі пачатак доўгага спіса дасягненняў юнай каманды. Але не толькі ў оперным дзействе ўдзельнічаюць маленькія артысты — у балетных пастаноўках «Шчаўкунок», «Эсмеральда», «Карміна Бурана» таксама задзейнічаны дзіцячы хор. Да таго ж тэатр-студыя — часты госць канцэртных праграм: дзіцячы хор пад акампанемент аркестра Вялікага тэатра выконвае розныя сусветныя творы не толькі разам са знакамітымі салістамі оперы, але і ў адзіночку. Удзельнікі студыі сваімі юнымі, але не пазбаўленымі прыгажосці галасамі літаральна «прабіваюць» велізарную залу.

Алена Сакалоўская, хормайстар студыі, Таццяна Панасюк, яе канцэртмайстар, а таксама

Наталля Бараноўская і Наталля Кузьмянкова, рэжысёры тэатра оперы і балета, і салістка Вялікага Таццяна Гаўрылава — выхадцы з дзіцячай музычнай тэатр-студыі. Многія з выпускнікоў звязалі сваё жыццё з выканальніцкім мастацтвам: Іван Вабішчэвіч (больш вядомы як Дзядзька Ваня), Глеб Матвяйчук, знакамітая піяністка Марына Рамейка, якая цяпер жыве ў Германіі і дае мноства канцэртаў па ўсім свеце, джазавая вакалістка Наталля Макарава (Санкт-Пецярбург), кінаактрыса Ксенія Малахвейчук... Іх імёны на слыху, аднак мала хто ведае, што ўсе яны пачыналі свой творчы шлях з дзіцячай студыі беларускага опернага тэатра. Былыя артысты ДМТС навучаюцца не толькі ў Беларускай дзяржаўнай акадэміі музыкі, але і ў Маскоўскай кансерваторыі, ды іншых замежных навучальных установах.

— Хоць нашы дзеці і ўдзельнічаюць у «дарослых» спектаклях, не выключана магчымасць пастаноўкі, дзе акцёрскі склад — толькі акцёры ДМТС, — гаворыць кіраўнік студыі з 1992 года Алена Няронская. — Усё залежыць ад рашэння мастацкага кіраўніцтва тэатра. І такія спектаклі былі: «Кот у ботах», «Пітэр Пэн»...

ДМТС можна без перабольшвання назваць першай сур'ёзнай прыступкай у жыцці для яе ўдзельнікаў. «Студыйцы — таксама артысты, толькі маленькія. Мы не гуляем у тэатр!» — не стамляецца паўтараць Алена Няронская, назіраючы за поспехамі сваіх выхаванцаў.

Настасся СУРЫНАВА,
вучаніца 10 класа
гімназіі № 8 г. Мінска.

Байка з лесу

Няўрымслівы вожык

Жыў-быў на свеце вожык.
Звалі яго Жвавы.
Прозвішча меў такое,
бо ніколі не сядзеў на месцы.
Усе бегаў туды-сюды...
Была ў яго жонка
і пяцёра дзяцей.

— Трэба пабудаваць нам жыллё, — прыдумаў аднойчы вожык.

І зноў пачаў бегаць туды-сюды, шукаючы месца для будынка.

— Навошта нам дом, добра нам і пад імхом, цёпла і суха.

Адмяніў сваё рашэнне і зноў пабег некуды.

— Трэба ўжо рыхтавацца да зімы! — аб'явіў вожык наступным разам.

І загадаў сям'і збіраць грыбы. Але не прабег і пяці крокаў, як памяняў планы.

— Дзеці, збірайце яблыкі, вунь расце дзічка.

Маленькія вожыкі ўжо накалолі на свае іголкі па яблычку, як...

— Дзеці не трэба, яны кіслыя. Лепей назбіраем чарніц ды насушым на зіму.

Не паспелі вожыкі сабраць і па слоічку ягад, як тата загадаў абкладаць сваё жыллё сухім лісцем.

— Не, не трэба! Яно яшчэ мокрае! — сказаў неўзабаве вожык.

Іду туды не ведаю куды, бяру тое не ведаю што, — нарэшце неяк прызнаўся сам галава сям'і.

— Ой, тата! — закрычаў самы малодшы з вожыкаў. — У цябе сем пятніц на тыдні.

...Так і бегае ўся сям'я за сваім бацькам і мужам. Топчуць лапкамі то туды, то сюды...

Анастасія ЯРАХНОВІЧ,
вучаніца 11 класа
гімназіі № 12 г. Мінска.